Паштовая сувязь у лічбах. Вынікі першага паўгоддзя 2026 года

Сённяя сетка паштовай сувязі краіны налічвае больш за **3 900** аб’ектаў паштовай сувязі, з іх **71%** аб’ектаў размешчаны ў сельскай мясцовасці.

Паслугі паштовай сувязі агульнага карыстання па перасылцы паштовых адпраўленняў, прыёме падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі і іх дастаўцы на падставе ліцэнзіі аказваюць **28 аператараў паштовай сувязі**.

Сярод паспяхова рэалізаваных за апошнія гады інавацыйных праектаў у сферы лічбавізацыі паслуг паштовай сувязі можна вылучыць наступныя:

сэрвіс **«Мабільны паштальён»** дазваляе карыстальнікам атрымаць шырокі спектр паслуг паштовай сувязі, банкаўскіх і іншых паслуг па-за аб’ектам паштовай сувязі. За першае паўгоддзе 2026 года з дапамогай сэрвісу аказана больш за **11,8** млн. паслуг;

паштаматы павышаюць узровень абслугоўвання карыстальнікаў і скарачаюць іх час чакання пры атрыманні паштовых адпраўленняў. Сетка паштаматаў краіны складае больш за **238 адзінак**;

QR box з’яўляецца прыладай самаабслугоўвання, якая дазваляе афарміць і аплаціць перасылку паштовага адпраўлення ў асабістым кабінеце і адправіць яго ў аб’екце на прыладзе шляхам сканавання QR-кода. За першае паўгоддзе 2026 года з дапамогай QR box адпраўлена больш за **110,7** тыс. паштовых адпраўленняў.

З лістапада 2025 года нацыянальным аператарам паштовай сувязі ўкаранёны ў прамысловую эксплуатацыю ўласны маркетплейс **«POST MARKET»**, у тым ліку для прасоўвання тавараў беларускіх вытворцаў. На пляцоўцы размешчана больш за **31,5 тыс. тавараў**.

Малюнак



Source URL:
https://mpt.gov.by/pashtovaya-suvyaz-u-lichbakh-vyniki-pershaga-paugoddzya-2026-goda